**Тарнавецкая А.А.**

# Падагульненне вывучанага па тэме “Складназлучаныя сказы”

**Мэты:** адагульніць і сістэматызаваць веды вучняў пра складаназлучаныя сказы, іх пунктуацыйнае афармленне;
удасканальваць уменні вызначаць складаназлучаныя сказы, будаваць іх, правільна пунктуацыйна афармляць на пісьме, выкарыстоўваць у вусным і пісьмовым маўленні; спрыяць выхаванню пачуцця гонару і павагі да сваёй малой радзімы.
**Тып:** урок абагульнення і сістэматызацыі.
**Форма:** урок – практыкум
**Абсталяванне:** Беларуская мова: вучэб. дапам. для 9-га кл. ( Валочка Г.М. і інш., 2019), мультымедыйны праектар, карткі з заданнямі.
**Эпіграф:** Брэст мой старажытны, Брэст мой малады, крочыш ты наперад з намі праз гады. *А. Гарай “Брэсту”*

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

Стварэнне эмацыянальнага настрою.

**II. Мэтавызначэнне.**

**III. Праверка д/з.**

**IV. Актуалізацыя вывучанага па тэме.**

Давайце нагадаем, што вы ведаеце пра складаназлучаны сказ. А дапаможа нам у гэтым метад “белых плям” ( слайд).

1. Складаназлучаным называецца складаны сказ, у якім часткі звязаны пры дапамозе [ ] [ ]
2. Злучальныя злучнікі пазяляюцца на [ ], [ ], [ ].
3. Гэтыя злучнікі паказваюць на [ ] [ ] паміж часткамі.
4. Паміж часткамі складаназлучанага сказа існуюць [ ], [ ] і [ ] сэнсавыя адносіны.
5. Знакі прыпынку, якія могуць ставіцца паміж часткамі складаназлучанага сказа, гэта [ ], [ ], [ ].

**V. Паўтарэнне і сітэматызацыя вывучанага.**

**1. Зварот да эпіграфа.**

- Якія думкі і пачуцці выклікалі ў вас гэтыя радкі?

Спадзяюся, што гэтыя цудоўныя словы будуць гучаць у вашых сэрцах і дапамогуць працаваць на ўроку.

**2. Графічны дыктант** ( 1 вучань працуе ля дошкі).

Настаўнік чытае складаназлучаныя сказы, а вучні запісваюць іх схемы.

А) Успомнім пра родныя мясціны – і сэрца напаўняецца радасцю. [ = ] - [ - = ].

Б) То насунуцца хмары над Мухаўцам, то выгляне сонца. То [ = - ], то [ = - ].
В) Дзесьці ў парку грымела музыка ды чуліся дзіцячыя галасы. [ = - ] ды [ = - ].
Г) Афармленне вул. Савецкай стылізавана пад даўніну, а ў цэнтры вуліцы ўсталяваны помнік у гонар 1000-годдзя Брэста. [ - = ], а [ = - ].
Д) Заканчваўся люты, аднак надвор'е было па-вясенняму цёплым. [ = -], аднак [ - = ].
*На слайдзе дэманструюцца сказы + схемы.*
**Фізкультхвілінка (** *дэманструюцца слайды)*
- Падніміце правую руку тыя, хто любіць гуляць у парках нашага горада.
- Падніміце левую руку тыя, хто бачыў, як ліхтаршчык запальвае ліхтар.
- Падніміце абедзве рукі тыя, хто ведае, дзе знаходзіцца помнік Брэсцкай Бібліі.
- Павярніце галаву направа тыя, хто любіць бавіць час у Лядовым палацы спорту.
- Павярніце галаву налева тыя, хто ведае, дзе знаходзіцца новы футбольны манеж.
- Падніміцеся тыя, хто наведаў святочныя мерапрыемствы з нагоды 1000-годдзя Брэста.

**3. Творчае заданне.**

Перабудуйце простыя сказы ў складназлучаныя і вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі *( вусна, сказы дэманструюцца на слайдзе).*

1. З першага дня вайны Беларусь стала арэнай самых буйных бітваў. Першымі ўдар ворага прынялі пагранічнікі.
2. Байцы з дня на дзень чакалі наступлення. Загаду наступаць не было.

**4. Праца з тэкстам.**

Прачытайце тэкст. Вызначце тэму, асноўную думку. Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Адным -двума сказамі працягніце тэкст.

Гэта было на досвітку 22 чэрв...ня 1941 года. Н..мецкія войскі раптоўна напалі на нашу краіну і ў тую (ж) раніцу на Брэс..кую крэпасць і на горад абрушыўся агонь варожай арт..лерыі. З неба пасыпаліся бомбы але авалодаць крэпасцю з ходу ворагу (не) ўдалося.

Мужна абаранялася Брэс..кая крэпасць і гітлераўцы прымянілі тут сваё самае новае ўзбраенне.

- Хто ведае, колькі дзен трымала абарону Брэсцкая крэпасць?
- Назавіце вядомых вам абаронцаў крэпасці.

**5. Міні-тэст.**

1. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў.

А) Дождж пачынаў сціхаць, затое ўзняўся і абяцаў зрабіцца яшчэ больш моцным нізавы вецер.
Б) Ды нават і без дапамогі ветру ў сады прыходзіць той час, калі дрэвы, вызваліўшы галіны з-пад цяжару, шумяць усё роўна невясёла.
В) І ападаў на сад са звонам бліскучых буйных кропель рой, а з поўдня ехаў май зялёны да нас з вясёлкавай дугой.

Г) Чайкі нямала церпяць ад гэтага невялікага, але вельмі лютага драпежніка.

2. У якіх складаназлучаных сказах коска не ставіцца?

А) За акном мутнавата шарэла__ а па шкле спаўзаў дрыготкімі струменьчыкамі дождж.

Б) Сонца яшчэ не ўзыходзіла__ і над вёскаю цяпер стаяла нейкая асабліва спакойная, урачыстая цішыня.

В) У доле праз ссохлы быльнёг прабіваліся галінастыя калівы крапівы__ ды тырчалі сухія дубцы маліннiку.

Г) Можа, пройдзе дождж _ і мы пойдзем гуляць па горадзе.

3. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць кропку з коскай.

А) Секунда __ і вежа праляцела ўжо, знікла, засталася ззаду.

Б) Жыты нас паклонам вітаюць, страсаючы кроплі расы_ і цяжка галовы схіляюць да смай зямлі каласы.

В) Ідуць ад кожнага перона на ўсход і захад цягнікі, і ад апошняга вагона далёка свяцяць аганькі.

Г) Зашумела нудна восень шумам лісцяў, шумам сосен, даўшы волю хмарам_ ажно з гоняў Беларусі ў вырай вылецелі гусі, паплылі ўдаль шнурам.

4. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік.

А) Ён лёгка павёў левай рукой _ і палілася песня.

Б) Заўсёды за цялушкай забягала Макрыда альбо з’яўляўся сам Цыбал.

В) А з’ясі ты з бульбай скварку і работа пойдзе шпарка.

Г) Крушынскі спыніў каня і сам стаў азірацца навокал.

Адказы:

№1 – А, В; №2 – В, Г; №3 – Б, Г; №4 – А, В *( самаправерка на слайдзе*)

**6. Падвядзенне вынікаў.**

**7. Дамашняе заданне.**

**8. Рэфлексія**